http://www.polymia.by/2019/03/dlya-milyx-dam-korelichskie-karatisty-dostigli-polnoj-garmonii-shotokana-na-respublikanskix-sorevnovaniyax-v-uzde/

ПОЛЫМЯ

# ДЛЯ МИЛЫХ ДАМ. КОРЕЛИЧСКИЕ КАРАТИСТЫ ДОСТИГЛИ ПОЛНОЙ «ГАРМОНИИ ШОТОКАНА» НА РЕСПУБЛИКАНСКИХ СОРЕВНОВАНИЯХ В УЗДЕ

**04.03.2019**

**🏆 Клуб “Белы тыгр” распачаў вясну са спартыўнага падарожжа ў Мінскую вобласць. У горадзе Узда 2 сакавіка адбыліся ў 14-ы раз Рэспубліканскія спаборніцтвы па шотакан каратэ-до “Гармонія шотакану”.**



Больш **за 180 спартсменаў з 17 клубаў Беларускай федэрацыі шотакан каратэ-до** выйшлі на татамі за перамогай. Нашы “белыя тыграты” **Аляксей Дораш**, **Кірыл Куліцкі**, **Ягор Сякач**, **Мікалай Касцюк** і **Кірыл Арцюх** не спужаліся такой высокай канкурэнцыі і ўпэўнена ўступілі ў барацьбу.

Разам са сваімі выхаванцамі, але ў «ветэранскім» раздзеле, выступіў і трэнер юных спартсменаў **Аляксандр Абадзінскі**.

🏆 Як заўжды, усе нашы хлопцы годна змагаліся. Поспех клубу “Белы тыгр” прынёс **Ягор Сякач**. Юны, але дастаткова дасведчаны, спартсмен стаў пераможцам у раздзеле кумітэ 10-11 гадоў, а таксама заваяваў адразу дзве бронзы ў ката 8-7 кіу 10-11 гадоў і кумітэ 10-11 гадоў.




🏆 Віншаванні прымаў 2 сакавіка і кіраўнік клуба **Аляксандр Абадзінскі**. У яго – другое месца ў абсалютнай катэгорыі ката «інструктары».

А прысвяціў свае перамогі клуб “Белы тыгр” прадстаўніцам чароўнай паловы чалавецтва – жыхаркам Карэліцкага раёна.

**Марына КАЗЛОВІЧ**

Паводле інфармацыі з [сайта клуба “Белы тыгр”]